Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ЛІПЕНЯ 2017 г. СУБОТА №144 (28508)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Каб работа не стала рабствам

СТАР. 6



Як «Звязда» пісала гісторыю

СТАР. 7



Нясумны адпачынак на Радзіме

СТАР. 21

# Сонечны час



Полацк. Дзіцячы музей. Старшы навуковы супрацоўнік Таццяна СМІРНОВА каля скульптуры «Дзяўчынка з сонечным гадзіннікам», устаноўленай у двары. Дарэчы, гэты сонечны гадзіннік — адзіны ў горадзе над Дзвіной і паказвае дакладны час.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына НАРКЕВІЧ, намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Мы не пабаяліся, унеслі прапановы па адмене ліцэнзавання продажу алкаголю і тытунёвых вырабаў. Цяпер гэтыя прапановы разглядаюцца ў Мінэканомікі. Гэта таксама падыходы па лібералізацыі ў сферы гандлю. Асноўная мэта — знізіць адміністрацыйныя нагрузкі на бізнес і не перашкаджаць гандлю працаваць, развівацца».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9396 | ▼ |
| Еўра | 2,2700 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0748 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Космас — наш!

## ПЕРШАЯ ПЯЦІГОДКА

### Беларускі касмічны апарат рухае прамысловасць

**Запуск першага айчыннага спадарожніка даў штуршок развіццю шэрагу адгалінаванняў прамысловасці. Апарат мае абсталяванне беларускай вытворчасці, і дзякуючы паспяховай пяцігадовай гісторыі яго эксплуатацыі кваліфікацыя нашых распрацоўшчыкаў і якасць тэхнікі былі пацверджаны. Так, ААТ «Пеленг» ужо цяпер мае неблагі партфель заказаў на мэтавую апаратуру, таксама дадатковы імпульс атрымаў завод «Інтэграл».**



— Праект, які быў ініцыяваны ў 2003 годзе, даў моцны штуршок для развіцця новых адгалінаванняў нашай прамысловасці, — лічыць **дырэктар УП «Геаінфармацыйныя сістэмы» НАН Беларусі Сяргей ЗАЛАТЫ.** — Фактычна, у краіне створана новае касмічнае адгалінаванне. Мы захавалі патэнцыял, які застаўся ў нас з часоў СССР, і адначасова здолелі выйсці на новы ўзровень. Важна, што створана аснова для падрыхтоўкі кадраў — у шэрагу ВНУ адкрыты спецыяльнасці па аэракасмічнай адукацыі. Больш за тое, Белдзяржуніверсітэт ужо стварыў свой нанаспадарожнік, які плануецца запусціць налета.

СТАР. 3

■ Дзеля памяці

## ТРЫ ВАЙНЫ — НА АДЗІН ЛЁС

### Пра савецка-фінляндскую, Вялікую Айчынную і вайну з Японіяй Якаў Чыстабаеў гаварыць не любіў. Красамоўныя — яго ўзнагароды

**Галоўную — ордэн Чырвонай Зоркі — жыхар Бабруйска, на жаль, так і не атрымаў. Ён нават падумаць не мог, што тады, у лютым 1945-га, адным з першых пераправіўшыся на супрацьлеглы бераг ракі Пасарге (ва Усходняй Прусіі) і адбіваючы контратакі праціўніка, здзяйсняе, як сёння прынята казаць, подзвіг...**

СТАР. 4




Фота Ірыны РАБАВАЙ.

Праўнучка і дачка Якава ЧЫСТАБАЕВА з партрэтам свайго гераічнага продка.

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 11 дзён

## На ўсе 100!!!

**«Звязда» запрашае вас, шаноўныя чытачы, вашых блізкіх і сяброў на спартыўнае свята, якое адбудзецца сёння на спартыўнай пляцоўцы сталічнага ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).**

**Пачатак у 11.00. УВАХОД ВОЛЬНЫ.**

**Падрабязнасці на нашым сайце www.zviazda.by**